# Шчырая песня салдата з вёскі Альшоў

І на старасці год сваіх да драбніц вывучаю родную матчыну мову, каб глыбей і шырэй пазнаць багатую культуру свайго народа, гісторыю роднага краю.

Ужо ў каторы раз карпатліва знаёмлюся з выданнем 12-м падручніка для 6—7 класаў з беларускай мовай навучання аўтараў У. Андрэенка і М. Яўневіч «Беларуская мова». З увагай у параграфе «Правапіс канчаткаў назоўнікаў у адзіночным ліку» у практыкаванні 163 выразна чытаю тэкст: «Родны край, дарагая Радзіма! Ты заўсёды ў нашых сэрцах, у нашых думках і пачуццях. Усё, што зроблена, дасягнута ў жыцці, звязана з табой, з тваімі клопатамі і любоўю. Ты вечна будзеш свяціць нам сваімі яснымі зорамі, узыходзіць ласкавым сонцам, звінець неўміручай матчынай песняй. Табе да канца жыцця мы прысвячаем сваё лепшае слова, свае шчырыя думкі і пачуцці, свае справы. Ты — наша надзея, наша жыццё, радасць. Ты — наша сонца...». У думках з усхваляваннем чытаю прозвішча аўтара гэтых радкоў (П. Прыходзька). Зачараваны тэкстам, успамінаю, што ў свой прыезд у вёску саў і ў аўтабіяграфіі «Бацькоўскімі сцежкамі», змешчанай у кнізе «Пра час і пра сябе».

Пры паўтарэнні прыназоўнікаў і злучнікаў у гэтым жа падручніку ў практыкаванні 661 зноў заданне прачытаць і выразна адказаць, якія думкі і пачуцці выказаў паэт П. Прыходзька ў вершы «Мая школа».

Як толькі восеньскай
парой вясёла
Званок абвесціць
раніцы прыход, —
Мне кожны раз
прыгадваецца школа,
У якой вучыўся доўгіх
дзесяць год.
Яна мяне, як роднага,
страчала

## Да 75—годдзя П. Ф. Прыходзькі

Прыемным пахам хвоі,
дзеразы.
Любіў яе заўжды —
І ў снег падталы,
І ў восеньскія дні,
і ў маразы.

А пры вывучэнні правапісу канчаткаў назоўнікаў у множным ліку ў практыкаванні 784 трэба растлумачыць правапіс іх канчаткаў ва ўрыўку з верша «Першы гудок» (аб станцыі «Камунары»):

Палцёс мне тваязыка

ўмелым выкарыстанні вершаваных радкоў паэта-земляка:

Мы хочам знаць, чаго
яшчэ не знаем,
І прага ведаў мроіць
думкі нам.

вучні будуць наведваць з неўтаймаваным жаданнем урокі беларускай мовы і літаратуры, якія для іх стануць самымі цікавымі. Толькі патрэбна настаўнікам бездакорна ведаць і валодаць сваім прадметам, умець адказваць на самыя цяжкія пытанні сваіх вучняў, адкрываць вучням сваю душу і лічыцца чалавекам. Зліццё гэтых якасцей натуральна і неабходна для сапраўднага педагога, якога вучні жадаюць-мараць сустрэць.

А ў паэта-земляка вялікі духоўны скарб аб роднай хоцімскай старонцы паэмы: «Бесядскія віры», «Калыска паэта», «Дар князёўны» і цэлая нізка вершаў: «Родны кут», «Мой родны дом», «На радзіме», «Вёска Альшоў», «Вёска Ліпаўка», «Хоцімская камуна» і дру-

людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны. І сам паэт у радах воінаў-вызваліцеляў ішоў па краіне, па Еўропе. На адным з франтавых фотаздымкаў, змешчаных у зборніку «Дні паэзіі», можна бачыць Пятра Прыходзьку перад будынкам павержанага рэйхстага.

Яго верш «Помнік савецкаму салдату ў Берліне» (салдат-мінчанін Лук'яновіч ахвяраваў сваім жыццём, каб выратаваць нямецкую дзяўчынку) стаў хрэстаматыйным. Нельга без хвалявання чытаць верш «Апалены сон», прысвечаны памяці танкіста-камісара настаўніка Вялікаліпаўскай школы Максіма Захаравіча Шаўцова, які склаў сваю юную галаву ў грандыёзнай танкавай бітве на Курскай дузе. Кранае сэрца верш «Балада пра салдата» (пра артылерыста Мікалая Сірацініна, які загінуў у першыя дні вайны пад Крычавам).

З друку выйшла больш дваццаці зборнікаў-кніг паэзіі юбіляра. На чарзе новая кніга паэзіі «Каляровыя халады», у якую ўключаны вершы, балады, паэмы, напісаныя ў апошнія два-тры гады.

Трасціно ў лютым 1971 года выдатны паэт-зямляк падарыў сваёй аднавяскоўцы, выкладчыцы беларускай мовы і літаратуры, маёй жонцы кніжку «Слова пра родны кут» з аўтографам: «Паважанай Галіне Паўлаўне — шчыраму, цудоўнаму чалавеку, які захоўвае ў сваім сэрцы глыбокую любоў да роднай зямлі і вучыць любіць яе нашых дзяцей сваім цёплым словам пра родны кут — Хоцімшчыну, дзе

Кожная травінка мае свой тут пах,
Кожная птушынка мае свой узмах.
Мы ж дамоў дарогу знаем у бары,
Як вада да мора ў сівым Дняпры».

— Хоцімшчына для мяне, — гаварыў у дапаўненне госць, — самы блізкі і родны кут, куды я прыязджаю летам ці вясной, і адчуваю ўсёй душой пах роднай зямлі, шчодрасць і ласку чалавечых сэрцаў, сардэчнасць сваіх землякоў, аб чым я і расказваю ў нарысе «Праз усё жыццё» у гэтай кніжцы, пра гэта я пі-

сундучок драуляны
Да самых рэек,
дзе стаяў цягнік.

А ў падручніку «Беларуская мова» для 8—9 класаў гэтыя аўтары пры паўтарэнні вывучанага ў практыкаванні 570 даюць заданне паставіць знакі прыпынку і растлумачыць іх зноў з урыўка гэтага верша:

Я мчаўся ў свет
З сваёй юнацкай марай,
Глядзеў на Бесядзь — родную раку.

Падагульняючы думкі, не будзе перабольшваннем сказаць, што шматлікія вершы паэта-земляка, змешчаныя ў школьных падручніках і кнігах для пазакласнага чытання для вучняў, Пятра Фёдаравіча даюць падставу лічыць яго настаўнікам. І клас у яго вельмі вялікі: цэлая рэспубліка, і вучняў у яго вельмі многа — сотні тысяч. Выкладчыкам жа беларускай мовы і літаратуры на Хоцімшчыне трэба ганарыцца сваім земляком, які дапамагае ў вывучэнні дзіўнай роднай мовы. І пры

ца кожнага хацімчаніна, калі па-майстэрску прачытаць радкі з лірычнага рэпартажа «Мая Магілёўшчына»:

Магілёўшчына — край мой любімы!
Ганаруся я славай тваёй.
Ты — часцінка вялікай Радзімы,
Што жыве шматмільённай сям'ёй.

Думаю, што прывабяць увагу і не будзе бяздушным, абыякавым выхаванец у дзіцячым садку альбо дашкольнік, калі яму прачытаць радкі з верша «Родны кут»:

Каля вербаў па-над рэчкай
Хаты нашай вёскі,
Дзе-нідзе, нібыта свечкі,
Белыя бярозкі.

Часта свае вершы аб Хоцімшчыне Пятро Фёдаравіч дасылае ў раённую газету, з якой не парывае сувязі, бо благаслаўленне атрымаў 5 мая 1936 года: на старонках нашай газеты быў надрукаваны яго першы верш «Стаханаўскі май». Але ж магістральная лінія ў творчасці паэта — гераічная барацьба савецкіх

У адрас юбіляра Мікола Ваданосаў напісаў:

### ГОЛАС ВЁСКІ АЛЬШОЎ

Па-над Бесяддзю людна, не глуха,
П'ецца-льецца там, нібы рака,
З паліваных гаршкоў медавуха
За здароўе Пятра-земляка.
Там збіраў ён нямала арэхаў,
І рабіў у жыцці першы крок...
З таго часу паўсвету аб'ехаў
Наш зычлівы Прыходзька Пятрок.
Пачынаў сваю сцежку з Альшова
Беларускі вядомы паэт,
Майстар шчырага, трапнага слова —
Мы яго павіншуем, як след.
Мы дадзім і зайчынага хлеба,
І застольную разам спяём,
Мы сустрэнем яго, як і трэба,
І на шчасце гаршчок... разаб'ём.

У дапаўненне пажадаем плёну ў напісанні добрых шчыра юбіляру творчага новых вершаў, здароўя, даўгалецця і шчасця.

**М. ЛАСОЎСКІ.**
**Вёска Трасціно.**

**Ласоўскі, М.** Шчырая песня салдата з вёскі Альшоў / М. Ласоўскі : [да 75-годдзя П.Ф. Прыходзькі] // Шлях Кастрычніка. — 1995. — 7 сакавіка. — С. 4.